# Уклад лабараторыі

Супрацоўнікі Салігорскай навукова - даследчай лабараторыі сумесна з вытворчым аддзелам Першага калійнага камбіната распрацоўваюць план рэканструкцыі Першага калійнага. Адначасова закончаны работы па мантажу камбініраванай схемы абагачэння сільвініту на доследнай фабрыцы. Хутка будуць праводзіцца доследы. Яны дазволяць распрацаваць рэгламент для ўкаранення гэтай схемы на Трэцім калійным, што дасць магчымасць выпускаць высакаякасны, буйнакрышталізаваны калій. У выніку павысяцца тэхніча-эканамічныя паказчыкі і панізяцца расходы рэагентаў пры флатацыі сільвініту.

У лабараторыі вядуцца вялікія работы па ўдасканаленню працэсу абясшламлівання калійных руд і абязводжвання шламаў, што дасць магчымасць у бліжэйшы час паменшыць пляцоўкі для складзіравання шламаў. Акрамя праводзімых даследчых работ на доследнай фабрыцы, супрацоўнікі лабараторыі прымаюць удзел у наладцы працэсу абагачэння на Другім калійным камбінаце.

Распрацоўка і ўкараненне ў вытворчасць новага абсталявання і высокапрадукцыйных метадаў працы дапамогуць калектывам камбінатаў дасягнуць новых поспехаў у выпрацоўцы калійных угнаенняў. Такія супрацоўнікі лабараторыі, як В. Авілаў, В. Барада, З. Падлесная і лаборанты Т. Бабко, Т. Шпакоўская, многа зрабілі для гэтага. І калі пяцігадовы план выконваецца паспяхова калектывамі камбінатаў, то ў гэтым немалая заслуга і супрацоўнікаў ВНИИГа.

**І. МАХЛЯНКІН,**
**кіраўнік сектара лабараторыі.**